**Казаніна В.Ю.**
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# АНАЛІЗ НАВУКОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ І АКТУАЛЬНАСЦЬ ДАСЛЕДВАННЯЎ НУМІЗМАТА В.Н. РАБЦЭВІЧА

За апошні час узрастае актуальнасць вывучэння нумізматыкі як навуковай дысцыпліны, адбываецца дынамічнае развіццё і асваенне дадзенай навукі ў многіх сучасных напрамках. Вывучэнне нумізматыкі як візуальнага мастацтва дазваляе вызначыць спецыфічныя рысы майстроў, лепш зразумець іх метады чаканкі манет. Цікавасць выклікаюць працы нумізматаў і мастацтвазнаўцаў, прысвечаныя матывам прымянення розных вобразаў і кампазіцыйных элементаў старадаўніх манет.

Менавіта ў гэтым напрамку і працаваў заснавальнік беларускай навуковай нумізматыкі Валянцін Навумавіч Рабцэвіч (мал. 1). У яго працах маляўніча апісаны ідэнтыфікацыйныя прыкметы першых манет, якія выраблялiся на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай і суседніх дзяржаў. У яго кнізе «Аб чым расказваюць манеты» ўпершыню былі прадстаўлены характарыстыкі чаканных манет, а само выданне суправаджалася вялікай колькасцю ілюстрацый. Рабцэвіч здолеў сістэматызаваць звесткі аб геаграфіі распаўсюджвання, разнастайнасці манетнага матэрыялу, тыпах манет і асаблівасцях іх чаканкі. Яго даследаванні дазваляюць ахарактарызаваць уладальніка манет, даюць магчымасць аднесці яго да заможнага насельніцтва ў розныя эпохі станаўлення беларускай дзяржаўнасці [5]. Кніга прынесла аўтару велізарны поспех, таму што ў той час яшчэ не існавала даведнікаў для музейных работнікаў, якія дазвалялі б усталяваць сапраўднасць манет і іх індывідуальныя характарыстыкі. Багата ілюстраваная, у пэўным сэнсе нават кампазіцыйная кніга спадабалася аматарам старажытнасцей і атрымала прызавое месца на міжнароднай кніжнай выставе ў горадзе Осака (Японія).



*Малюнак 1 – Археалагічныя раскопкі на Брылёўскім полі пад кіраўніцтвам Валянціна Рабцэвіча, 2000 г.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Таксама плённа В.Н. Рабцэвіч займаўся і археалагічнымі даследаваннямі. Больш за дваццаць пяць гадоў ён прымаў удзел у раскопках старажытнарускіх курганоў. Самі ж раскопкі праводзіліся экспедыцыяй Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў Віцебскай, Гомельскай і Мінскай абласцях. На іх падставе Валянцін Навумавіч апублікаваў сур'ёзныя манаграфічныя публікацыі. Ён з'яўляўся адным з аўтараў, якія падрыхтавалі «Нарысы па археалогіі Беларусі» (ч. 2, 1972). У прыватнасці яму належыць раздзел «Грашовы абарот», напісаны ў суаўтарстве з беларускім археолагам Г.В. Штыхавым [8, с. 329]. Абагуліўшы вынікі даследаванняў археалагічных помнікаў Беларусі, навукоўцы змаглі апісаць побыт і жыццёвы ўклад многіх старажытных плямёнаў, якія знаходзіліся на дадзенай тэрыторыі ў эпохі палеаліту, мезаліту і неаліту [2]. Гэтая праца ўнесла істотны ўклад у вывучэнне праблемы нацыянальнага самавызначэння як складніка часткі культурнай спадчыны Беларусі.

Кладаведзенне ў Рэспубліцы Беларусь развівалася дастаткова павольным тэмпам, аднак, дзякуючы працам Рабцэвіча, цікавасць да кірунку ўзрастала, што дазволіла вылучыць яго ў асобную галіну навукі. Вучоны разглядаў скарбы як асноўныя крыніцы калекцыйнага матэрыялу. У яго дысертацыі «Расійска-«Польскія» манетныя эмісіі эпохі Пятра I» даследаваліся матывы, традыцыі і павер'і ўтварэння скарбаў, апісваліся месцы іх выяўлення. В.Н. Рабцэвіч дэталёва апісваў метралагічныя і якасныя характарыстыкі «шастакоў і тынфаў» (старажытных польскіх манет). У кнізе размешчаны даведачныя матэрыялы, прысвечаныя знаходкам, легендам, тыпалогіі «шастакоў і тынфаў» у музейных зборах. Была складзена тапаграфія знаходак «тынфаў». Шэраг высноў аўтара дазволіў абгрунтаваць крытэрыі працы Сеўскага манетнага двара [6, с. 27]. Такім чынам, кандыдацкая дысертацыя В.Н. Рабцэвіча можа лічыцца асновай для правядзення наступных навуковых даследаванняў адразу ў некалькіх навуках: мастацтве, гісторыі і этнаграфіі.

У працэсе напісання дысертацыі навуковец прааналізаваў больш за тысячу скарбаў, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі. У працы прадстаўлены звесткі аб новых скарбах, апісанне якіх было ўпершыню ўключана ў навуковую сферу (больш за 250 прадметаў). Валянцін Навумавіч быў першым, хто апублікаваў поўны звод «тынфавых манет», якія захоўваюцца ў музейных зборах і ў прыватных калекцыях Беларусі, Украіны, Літвы, Расіі, ФРГ і ЗША. Выкарыстанне аўтарам архіўнага матэрыялу дазволіла больш дэталёва ахарактарызаваць інфармацыю аб 620 скарбах, якія мелі да гэтага толькі агульную характарыстыку ў разнастайных выданнях.

Вялікую ўвагу Рабцэвіч надаваў вызначэнню ступені каштоўнасці скарба (атрыбуцыі манет). Калі аналізаваць яго высновы, можна сказаць, што вызначэнне якасных характарыстык манет, іх гістарычнага і культурнага значэння ў сінтэзе з мастацтвазнаўчымі фактарамі дазваляе дастаткова дакладна вызначыць іх кошт [3, с. 54]. Аўтарскі аналіз колькаснага і якаснага складу манетных скарбаў, а таксама высновы аб іх распаўсюджанасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з'яўляюцца сведчаннем эканамічнага ўзроўню развіцця насельніцтва ў перыяд абароту манет.

Камплектаванне многіх дзяржаўных нумізматычных калекцый у значнай ступені адбывалася і адбываецца дзякуючы прыватным калекцыям. Беларускія краязнаўцы старанна апісвалі помнікі даўніны, якія існуюць на тэрыторыі краіны, а таксама перадавалі ў музеі знойдзеныя археалагічныя прадметы, у тым ліку і манеты. Валянцін Навумавіч сабраў асабістую калекцыю, якую з цягам часу перадаў Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту, на гістарычным факультэце якога ён стварыў найбуйнейшы на тэрыторыі Беларусі нумізматычны кабінет [1, с. 2].

Нумізматыка – гэта значная крыніца для вывучэння мастацтва і гістарычнага развіцця любой дзяржавы. Аднайменная кніга В.Н. Рабцэвіча прысвечана вывучэнню многіх з'яў. Пры гэтым геаграфія даследаванняў у дадзенай кнізе значна пашырана (ад антычных манет на тэрыторыі Беларусі да савецкай грашовай сістэмы). Прадастаўленыя навукоўцам высновы і характарыстыкі дазволілі яму скласці манетны каталог [6, с. 355], які можа выкарыстоўвацца як даведнік для мастацтвазнаўцаў, гісторыкаў, нумізматаў і музейных супрацоўнікаў.

Нумізматыка Беларусі служыць для вывучэння спецыфікі чаканкі манет і метадалогіі развіцця манетнай справы ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Расійскай Імперыі і іншых дзяржаў. Мастацтвазнаўча-гістарычны аналіз манет спрыяе выяўленню важных фактараў гістарычнага і культурнага развіцця краіны. Згодна з гэтым, навуковая дзейнасць В.Н. Рабцэвіча несаразмерна паўплывала на развіццё нумізматыкі ў Рэспубліцы Беларусь. Яго працы паслужылі асновай для ідэнтыфікацыі чаканных манет, вызначэння іх кошту і гісторыка-мастацтвазнаўчага значэння.

Лёс культурнай і гістарычнай спадчыны Беларусі, пытанні яе разумення і захавання праз вывучэнне старадаўніх манет розных эпох былі прадметам навуковых даследаванняў Рабцэвіча. Яго навуковыя заслугі былі высока ацэнены. Ён з'яўляецца лаўрэатам прэміі імя Пічэты, Ганаровым членам «Беларускага нумізматычнага таварыства», узнагароджаны залатымі знакамі Беларускага і Польскага нумізматычных таварыстваў [1, с. 2].

Асноўнай мэтай напісання кніг Валянціна Рабцэвіча было вызначэнне, апісанне, сістэматызацыя і ацэнка старадаўніх манет, знаходзячыхся ў абароце на тэрыторыі дзяржаў, якія былі размешчаны на беларускіх землях у XV-XVIII ст. Асобным кірункам у яго працах стала кладаведзенне. Ён здолеў вывесці дадзеную галіну на новы ўзровень у Беларусі. Яго працы – спадчына для многіх пакаленняў як беларускіх, так і замежных нумізматаў, мастацтвазнаўцаў і гісторыкаў.

Сучасныя нумізматычныя даследаванні, заснаваныя на працах Валянціна Навумавіча, уключаюць у сябе не толькі спосабы вывучэння манет, такія, як аналіз малюнкаў і надпісаў, узважванне і абмер, але і больш складаныя метады,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

напрыклад, вызначэнне пробы, паштэмпельны аналіз, статыстычныя падлікі, вымярэнне удзельнай цеплаёмістасці і іншае. Усё гэта сведчыць аб значным патэнцыяле нумізматыкі, а таксама аб унікальнасці і каштоўнасці прадметаў нумізматычных калекцый, якія належыць дэталёва вывучаць.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Козьянковский клад арабских куфических дирхамов IX-X веков из музейного собрания Национального Полоцкого историко-культурного музея-заповедника / под ред. Т.А. Джумантаевой [и др.]. – Минск, 2011. – 44 с.: ил.

2. Очерки по археологии Белоруссии. Ч. 1 / Редкол.: В.Ф. Исаенко [и др.]. – Мн.: Наука и техника, 1970. – 272 с.; ил.

3. Рябцевич, В.Н. Клады: атрибуция, классификация, интерпретация / В.Н. Рябцевич // Банкаўскі веснік. – 2005. – № 22 (315). – С. 54-60.

4. Рябцевич В.Н. Монетные клады XVII и первой четверти XVIII в. на территории Чернигово-Северской земли и Восточной Белоруссии / В.Н. Рябцевич // Нумизматика и сфрагистика. – Киев: Наукова думка, 1963. – Т. 1. – С. 152-202.

5. Рябцевич, В.Н. О чем рассказывают монеты / Под ред. доктора исторических наук А.П. Игнатенко. Изд. 2-е, перераб. и доп. – Минск: Нар. асвета, 1977. – 399 с.: ил.

6. Рябцевич, В.Н. Российско-«польские» монетные эмиссии эпохи Петра I: автореф. монографии д-ра истор. Наук / В.Н. Рябцевич. – Мн., 1996. – 36 с.

7. Рябцевич, В.Н. Нумизматика Беларуси / В.Н. Рябцевич. – Минск: Полымя, 1995. – 687 с.: ил.

8. Синчук, И. Библиография работ В.Н. Рябцевича 1963-2011 гг. / Стрелец М.В., Баюра А.Н. // Numizmatika. T. 9-12. Metraštis 2008-2011. – Vilnius, 2012. – P. 320-330.

9. VNR – В.Н. Рябцевич // Цифровой фотоархив БГУ [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://earchives.bsu.by/handle/link/1869. – Дата доступа: 06.12.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Біліченко Л.С.**

***м. Миколаїв***

## КОЗАЦЬКІ ПОСЕЛЕННЯ НА МИКОЛАЇВЩИНІ (ДРУГА ПОЛОВИНА XV –XVIII СТ.)

Історія краю або краєзнавство є одним із найцікавіших напрямків сучасної науки. І обумовлено це тим, що ніколи не вичерпається допитливість людини, котра прагне дізнатися, що відбувалася на землі, де вона народилася і живе, що було до неї, як ці люди жили, що переживали, з якими труднощами стикалися, як їх переборювали; а ще їх побут, одяг, свята і будні, і, зазвичай, цікавить їх воєнне мистецтво, зокрема, морська вправність – словом, вся різнобарвна палітра життя. Одним з головних напрямів краєзнавства є історичне краєзнавство, що акцентує увагу на вивченні та популяризації історичних